УДК 37.032

# Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў у працэсе засваення зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»*

(Заканчэнне. Пачатак у № 10 за 2024 год.)

**Паноў Сяргей Веніямінавіч,**
вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*swpanow@gmail.com*

В статье освещаются теоретические аспекты функциональной грамотности учащихся начальной школы, разработанные в соответствии с проектом Концепции формирования универсальных компетенций детей и учащейся молодёжи. Предлагается технологическая матрица формирования универсальных компетенций и функциональной грамотности учащихся в соответствии с изменениями в структуре и содержании программы по учебному предмету «Человек и мир. Моя Родина — Беларусь» к 2024/2025 учебному году.

**Ключевые слова:** универсальные компетенции; функциональная грамотность; начальное образование; учебная программа «Человек и мир. Моя Родина — Беларусь».

*Працяг табліцы 2*

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Раздзел 2. Гісторыя Беларусі ў паданнях, імёнах і падзеях (18 гадзін)** | | | |
| **Урок 9. Князёўна з трыма імёнамі** | | | |
| Летапісныя звесткі пра дачку полацкага князя Рагнеду і яе жыццёвы лёс | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай карт атласа | Паказвае на картах атласа Полацкае княства (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць*) |

*Артыкул падрыхтаваны на аснове матэрыялаў даследавання, праведзенага па заданні «Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі» ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» (2021—2025 гады).

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў з дапамогай слоўніка | Тлумачыць змест тэрмінаў (князь, манахіня) з дапамогай гістарычнага слоўніка (*кампетэнцыі грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць*) |
| Тры імені полацкай князёўны: Рагнеда, Гарыслава, Анастасія | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Тлумачыць тры імені Рагнеды ва ўзаемасувязі з абставінамі яе жыцця і апорай на мастацкія ілюстрацыі (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць*) |
| Сын Рагнеды Ізяслаў | Удзел у экскурсіі ў Заслаўе | Тлумачэнне ўчынка чалавека ў гісторыі | Тлумачыць выбар Ізяслава з апорай на мастацкую ілюстрацыю і помнік Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць*) |
| **Урок 10. Сын Рагнеды Яраслаў Мудры** | | | |
| Старажытнаруская дзяржава ўсходніх славян Кіеўская Русь | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем | Паказвае на картасхеме вучэбнага дапаможніка горад Кіеў (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць*) |
| Асветніцкая дзейнасць вялікага кіеўскага князя Яраслава Мудрага. Зборнік законаў «Руская праўда» | | Актуалізацыя раней засвоеных тэрмінаў і пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрмінаў (дзяржава, шлях «з варагаў у грэкі», закон, сабор) з дапамогай гістарычнага слоўніка (*кампетэнцыі грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць*) |
| | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (партрэт Яраслава Мудрага) (*кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, інфармацыйная адукаванасць*) |
| Запавет Яраслава Мудрага сваім сынам | | Вызначэнне сэнсу запавета | Тлумачыць запавет Яраслава Мудрага яго сынам (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць*) |
| **Урок 11. Усяслаў Чарадзей** | | | |
| Звесткі пра полацкага князя Усяслава Брачыславіча. Бітва на Нямізе | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) Полацкае княства (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць*) |
| | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрміна «дружына» з дапамогай гістарычнага слоўніка (*кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць*) |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Полацкі Сафійскі сабор як сімвал магутнасці княства і гістарычны помнік | Удзел у экскурсіі ў Полацк | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (выява Полацкага Сафійскага сабора) *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 12. Еўфрасіння Полацкая** | | | |
| Жыццёвы выбар юнай Прадславы | | Тлумачэнне раней засвоенага тэрміна «манахіня» з апорай на звесткі пра хрысціянства | Тлумачыць жыццёвы выбар юнай Прадславы *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай і яе запавет людзям. Стварэнне Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Полацку | Удзел у экскурсіі ў Полацк | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (партрэт Еўфрасінні Полацкай з выявай Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы) *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць).*<br>Тлумачыць запавет Еўфрасінні Полацкай паважаць адзін аднаго, спыніць войны *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць)* |
| Крыж Еўфрасінні Полацкай як культурна-хрысціянская каштоўнасць беларускага народа | | Тлумачыць прызначэнне артэфакта (Крыжа Еўфрасінні Полацкай) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (Крыж Еўфрасінні Полацкай) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урок 13. У што верылі нашы продкі** | | | |
| Старажытныя вераванні жыхароў Беларусі. Купалле і Каляды | Удзел у святкаванні (тэатралізаваным прадстаўленні) Купалля ці Каляд | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрмінаў (Купалле, Каляды) з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| | Выраб каляднай зоркі | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкй ілюстрацыі (свята Каляд) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Прыняцце хрысціянства. Узнікненне цэркваў і манастыроў, заснаванне школ і бібліятэк | | Тлумачэнне тэрміна «манахіня» з яго зместавай канкрэтызацыяй адносна Рагнеды і Еўфрасінні Полацкай | Вызначае ўклад Рагнеды і Еўфрасінні Полацкай у пашырэнне хрысціянства, ролю Ізяслава ў развіцці пісьменнасці *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць)* |
| Праваслаўныя і каталікі. Прыхільнікі іншых рэлігій. Верацярпімасць | | | Тлумачыць правілы паважлівых адносін да людзей іншага веравызнання *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць)* |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Урок 14. У абарону сваёй зямлі** | | | |
| Аб'яднанне беларускіх і літоўскіх зямель супраць крыжацкай пагрозы ў адну дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага з вызначэннем яго першапачатковага цэнтра (Навагрудак) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| | Складанне стужкі часу | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць узнікнення Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага праз абазначэнні на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Вялікі князь Вітаўт. Грунвальдская бітва | Тлумачэнне прызначэння ўзбраення воінаў Вялікага Княства Літоўскага | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (крыжакі каля Навагрудскага замка, партрэт Вітаўта) *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урок 15. Пад сценамі старажытных замкаў** | | | |
| Замкі на тэрыторыі Беларусі: гісторыі і паданні, звязаныя з імі | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) месцы размяшчэння Навагрудскага, Лідскага, Крэўскага, Гродзенскага, Нясвіжскага, Мірскага замкаў *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Выгляд і ўмацаванні замкаў. Гродзенскі, Нясвіжскі, Мірскі замкі як помнікі гісторыі і культуры | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкіх выяў Навагрудскага, Гродзенскага, Нясвіжскага, Мірскага замкаў *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урокі 16, 17, 18. Адкуль пайшлі назвы нашых гарадоў** | | | |
| Беларускія гарады ў гістарычным мінулым. Полацк і Тураў | Складанне маршрута ўмоўнага падарожжа па гарадах Беларусі ў адпаведнасці з зададзенымі крытэрыямі | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) месцы размяшчэння згаданых у апяванні беларускіх гарадоў *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Наша сталіца і абласныя гарады ў старажытнасці | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкіх ілюстрацый (старажытны план Полацка, млынара Менеска) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |

*Працяг*

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Час узнікнення гарадоў | Складанне стужкі часу | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць узнікнення беларускіх гарадоў праз абазначэнні дат іх згадвання на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Паходжанне назваў гарадоў | Наведванне музея гісторыі горада | Вызначэнне дакладнасці паданняў | Тлумачыць версіі паходжання назваў гарадоў *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Гербы гарадоў | Самастойнае краязнаўчае даследаванне | Знаходжанне прыкладаў для пацвярджэння прапанаванага палажэння | Тлумачыць змест малюнкаў на гарадскіх гербах у рэгіёне свайго пражывання *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 19. Па якіх законах жылі нашы продкі** | | | |
| Законы штодзённага жыцця людзей | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў з дапамогай слоўніка | Тлумачыць змест тэрмінаў (веча, Статут) з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Агульнанародны збор у Полацкім княстве — веча | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай выявы правядзення веча *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| Статут Вялікага Княства Літоўскага. Леў Сапега | Атрыбутацыя Статута Вялікага Княства Літоўскага | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у тэкставую | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (партрэт Льва Сапегі з выявай вокладкі Статута Вялікага Княства Літоўскага) *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урок 20. Пачынальнік кнігадрукавання** | | | |
| Адукацыя Францыска Скарыны | Складанне маршрута падарожжа Францыска Скарыны па гарадах, дзе ён вучыўся | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай карт атласа | Паказвае на карце атласа Польшчу, Чэхію, Італію — краіны, дзе Францыск Скарына атрымліваў адукацыю *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Францыск Скарына як пачынальнік кнігадрукавання сярод усходніх славян. Афармленне выдадзеных Францыскам Скарынам кніг | Атрыбутацыя вокладкі Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынам | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (партрэт Францыска Скарыны з выявай вокладкі выдадзенай ім Бібліі) *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Патрыятычны запавет Францыска Скарыны | Адлюстраванне любові да роднага краю праз маляванне выяў звяроў, птушак, рыб, пчол, якія згадваюцца ў патрыятычным запавеце | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з тэкставай у наглядна-вобразную | Тлумачыць запавет Францыска Скарыны любіць свой народ і шанаваць матчыну мову *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць)* |
| Сымон Будны — прадаўжальнік справы Скарыны, выдавец першай друкаванай на тэрыторыі Беларусі кнігі | Удзел у экскурсіях у Полацк, Нясвіж | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (партрэт Сымона Буднага) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)*.<br>Тлумачыць запавет Сымона Буднага людзям жыць у міры, а калі неабходна, то бараніць сваю Радзіму; аб тым, што ўсе людзі, багатыя і бедныя, павінны быць роўнымі перад законамі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць)* |
| | Складанне маршрута падарожжа па беларускіх гарадах, дзе знаходзяцца помнікі Францыску Скарыне, Сымону Буднаму | Лакалізацыя месц памяці аб беларускіх першадрукарах з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) гарады, дзе ўстаноўлены памятнікі Францыску Скарыне (Полацк, Ліда, Мінск) і Сымону Буднаму (Нясвіж) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 21. У краіне майстроў і творцаў** | | | |
| Рамесніцкія вырабы народных майстроў. Шкляныя вырабы | Удзел у экскурсіях у школьныя ці краязнаўчыя музеі | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з тэкставай у наглядна-вобразную | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (шкляныя вырабы ў палацы і адзенне яго гаспадароў) *(кампетэнцыя мыслення, чытацкая адукаванасць)* |
| Каляровая кафля | | Супастаўленне сучаснай кафлі з яе узорам як артэфакта | Вызначае гістарычную пераемнасць са старажытнай кафляй *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Слуцкія паясы | Маляванне слуцкага пояса з арнаментам васілька | Мадэліраванне ўзора пояса з апорай на яго зададзенае апісанне | Тлумачыць парадак размяшчэння элементаў узору слуцкага пояса *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Адлюстраванне вырабу паясоў у паэтычнай творчасці Максіма Багдановіча | Вызначэнне радкоў верша Максіма Багдановіча ў песні «Слуцкія ткачыхі» ў выкананні ансамбля «Песняры» | Супастаўленне ўзору васілька з яго адлюстраваннем у сучасных вырабах | Вызначае гістарычную пераемнасць пры выкарыстанні ўзору васілька *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Урок 22. Ад батлейкі — да паланэза** | | | |
| Народны лялечны тэатр батлейка | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрміна «батлейка» з дапамогай гістарычнага слоўніка (*кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць*) |
| | Маляванне лялек батлейкі ў адпаведнасці з сюжэтам прадстаўлення | Мадэліраванне персаналій лялек з апорай на зададзены сюжэт | Тлумачыць выбар лялек для батлейкі (*кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць*) |
| Асветніцкая дзейнасць Сімяона Полацкага. Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з нагляднавобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (партрэты Сімяона Полацкага, Міхала Казіміра Агінскага з выявай Слонімскага тэатра) (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць*) |
| Паланэз «Развітанне з Радзімай» Міхала Клеафаса Агінскага | Вызначэнне зместу паланэза «Развітанне з Радзімай» у выкананні ансамбля «Песняры» | Удзел у абмеркаванні тэмы любові да Радзімы, адлюстраванай ў музычным творы | Тлумачыць змест музычнага твора (*кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, сацыякультурная адукаванасць*) |
| Уключэнне беларускіх зямель у склад Расіі | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі з дапамогай стужкі часу (*кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць*) |
| **Урок 23. Песняры роднай мовы і Бацькаўшчыны** | | | |
| Запавет Францішка Багушэвіча берагчы і шанаваць родную мову | | Тлумачэнне сэнсу запавета | Тлумачыць запавет Францішка Багушэвіча берагчы і шанаваць родную мову (*кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць*) |
| Пачуццё любові да Радзімы ў паэтычнай творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Паэтычная і народная спадчына ў музычнай творчасці Уладзіміра Мулявіна і ансамбля «Песняры» | Вызначэнне зместу песень «Мой родны кут» і «Спадчына» ў выкананні ансамбля «Песняры» | Тлумачэнне назвы ансамбля «Песняры» | Тлумачыць змест твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа (*кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, сацыякультурная адукаванасць*) |
| Святкаванне Дня беларускага пісьменства | Складанне сцэнарыя да Дня беларускага пісьменства | Лакалізацыя месц правядзення Дня беларускага пісьменства з дапамогай карт атласа | Складае карту з адзначэннем гарадоў, дзе праходзіў Дзень беларускага пісьменства (*кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць*) |

*Працяг*

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Урок 24. Будаўніцтва новага жыцця** | | | |
| 7 лістапада як агульнарэспубліканскае свята ў Рэспубліцы Беларусь. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Удзел БССР у стварэнні Савецкага Саюза | Складанне стужкі часу | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць гістарычных падзей (першае згадванне пра Полацк, утварэнне БССР) праз абазначэнне іх дат на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і стварэнне ў вёсцы калектыўных гаспадарак у 1920—1930-я гады | Запаўненне контурнай карты | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай карт атласа | Вызначае на картах атласа месцы размяшчэння кандытарскай фабрыкі «Спартак» у Гомелі і малочна-кансервавага камбіната ў Рагачове з улікам гістарычнай пераемнасці іх вырабаў *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Акцябраты і піянеры | Размеркаванне абавязкаў у акцябрацкай «зорачцы» | Мадэліраванне сваіх паводзін згодна з правіламі грамадскай арганізацыі і карысных спраў | Вызначае свае абавязкі і зону адказнасці пры ажыццяўленні калектыўнай працы *(кампетэнцыя кааперацыі, чытацкая адукаванасць)* |
| Дзяржаўныя мовы ў БССР у 1920—1930-я гады | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Вызначае мовы, на якіх зроблены надпісы на Дзяржаўным гербе БССР *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| | | | Тлумачыць заклік да дружбы людзей розных нацыянальнасцей, які адлюстраваны на Дзяржаўным гербе БССР і з'яўляецца запаветам для нас *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыякультурная адукаванасць)* |
| Становішча жыхароў Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. 17 верасня як дзяржаўнае свята Рэспублікі Беларусь | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць гістарычных падзей (стварэнне БССР, уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР) *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |

*Працяг*

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Урокі 25, 26. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны** | | | |
| Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня як памятная дата ў Рэспубліцы Беларусь | Складанне стужкі часу | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць гістарычных падзей (напад германскіх захопнікаў на Савецкі Саюз, вызваленне Мінска ад ворага, Дзень Перамогі) праз абазначэнне іх дат на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Вызначае Дзяржаўны герб БССР, які адлюстраваны на пагранічным слупе на помніку абаронцам Брэсцкай крэпасці *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)*.<br>Вызначае прыналежнасць Пеці Кацельнікава да піянерскай арганізацыі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Трагедыя беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны | | Мэтанакіраваны запыт крыніц з неабходнай інфармацыі | Выкарыстоўвае матэрыял аб трагедыі беларускага народа на с. 21 вучэбнага дапаможніка «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1—4 класы» *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Бацька Мінай і лёс яго дзяцей | Складанне ўмоўнага ліста да дзяцей Бацькі Міная | | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі (помнік загінулым дзецям Бацькі Міная ў двары сярэдняй школы ў Суражы) *(кампетэнцыя камунікацыі, чытацкая адукаванасць)* |
| Гістарычная памяць пра гібель жыхароў беларускай вёскі Хатынь і дзяцей — ахвяр вайны.<br>Подзвіг лётчыка Аляксандра Мамкіна па выратаванні дзяцей.<br>Легендарны подзвіг Трыфана Лук'яновіча | Мадэліраванне сваіх паводзін у канкрэтных сітуацыях | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Вызначае свае эмацыянальныя адносіны да гістарычных падзей, якім прысвечаны мемарыяльны комплекс дзецям—ахвярам вайны ў пасёлку Чырвоны Бераг і мемарыяльная дошка ў памяць аб Трыфану Лук'яновічу ў Мінску *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)*.<br>Вызначае, што абазначаюць коміны са званамі на месцы былых хат Хатыні *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)* |
| Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.<br>9 мая — Дзень Перамогі і 3 ліпеня — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь як дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь | Складанне плану святкавання (сцэнарыя свята).<br>Удзел у экскурсіях у мясцовыя музеі і музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | | Удзельнічае ў святкаванні Дня Перамогі і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Раздзел 3. Мая сучасная краіна (7 гадзін)** | | | |
| **Урок 27. Багацце нашай краіны** | | | |
| Вырабы беларускай прамысловасці | Мадэліраванне эмблем для кар'ерных самазвалаў «БелАЗ», грузавікоў «МАЗ», трактароў «Беларус» | Супастаўленне артэфактаў (помнікаў) з сучаснымі ўзорамі тэхнікі.<br><br>Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Параўноўвае пасляваенны і сучасны ўзоры кар'ерных самазвалаў «БелАЗ», грузавікоў «МАЗ», трактароў «Беларус» *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць).*<br>Параўноўвае гоначны грузавік «МАЗ» з зубрам *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Герой Беларусі канструктар аўтамабільнай тэхнікі Міхаіл Высоцкі | | | Тлумачыць паважлівае імя «Майкл Грузавік» канструктара аўтамабільнай тэхнікі Міхаіла Высоцкага *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Прадукцыя сельскай гаспадаркі | | Характарыстыка прадукцыі сельскай гаспадаркі, якая спажываецца паўсядзённа | Тлумачыць назвы «другі хлеб» адносна бульбы і «паўночны шоўк» адносна льна *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Святкаванне Дажынак | Складанне плана святкавання (сцэнарыя свята) | | Тлумачыць назву традыцыйнага народнага свята Дажынкі *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Герой Беларусі старшыня калгаса Аляксандр Дубко | Удзел у сустрэчах са знакамітымі землякамі з падрыхтоўкай пытанняў | | Параўноўвае выявы зорак Героя Сацыялістычнай Працы і Героя Беларусі *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| | Вызначэнне прадукцыі для нацыянальнага брэнда «Зроблена ў Беларусі». Маляванне беларускага народнага арнаменту | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Вызначае асноўныя элементы беларускага народнага арнаменту *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 28. Тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся** | | | |
| Наваполацк: новы горад побач са старажытным | Запаўненне контурнай карты | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) гарады Наваполацк, Салігорск, Жодзіна, месца размяшчэння Беларускай атамнай электрастанцыі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |

***Працяг***

| **Змест вучэбнай праграмы** | **Практыка-арыентаваныя работы** | **Асноўныя вучэбныя дзеянні** | **Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў** |
|---|---|---|---|
| Салігорск: здабыча прыродных выкапняў | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне працэсу здабычы калійнай солі ў шахце з апорай на фота *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Жодзіна: захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне ў горадзе, дзе вырабляюцца БелАЗы | | | Складае кароткае апісанне аб подзвігу малодшага сына Н. Ф. Купрыянавай з апорай на фота помніка *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Старажытны Астравец і першая беларуская атамная электрастанцыя | Мадэліраванне герба Астраўца ў сувязі з будаўніцтвам Беларускай атамнай электрастанцыі | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з тэкставай у наглядна-вобразную | Вызначае ўзор герба, які адлюстроўвае размяшчэнне побач з Астраўцом Беларускай атамнай электрастанцыі *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)* |
| Подзвіг пажарнага Васіля Ігнаценкі | Удзел у сустрэчах са знакамітымі землякамі з падрыхтоўкай пытанняў | | Вызначае свае эмацыянальныя адносіны да ўчынку пажарнага Васіля Ігнаценкі *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урокі 29, 30. Мінск — сталіца нашай краіны** | | | |
| Мінск — сталіца Беларусі, горад-герой. Адлюстраванне памяці пра гістарычныя падзеі, дзеячаў гісторыі і культуры ў назвах гарадскіх плошчаў, праспектаў і вуліц | Складанне маршруту ўмоўнага падарожжа па старажытнай частцы Мінска | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме абазначаныя на ёй гарадскія плошчы, праспекты і вуліцы, назвы якіх адлюстроўваюць памяць пра гістарычныя падзеі і дзеячаў гісторыі і культуры *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| | Удзел у сустрэчах са знакамітымі землякамі з падрыхтоўкай пытанняў | | Згадвае пра Еўфрасінню Полацкую, Кірыла Тураўскага, Францыска Скарыну, Сымона Буднага, Сімяона Полацкага, Францыска Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Янку Купалу, Якуба Коласа *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць* |
| | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне пра помнік «Звон Нагасакі» з апорай на фота і веды пра аварыю на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Герой Савецкага Саюза кіраўнік Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Пётр Машэраў | Удзел у экскурсіях у мясцовыя музеі і музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | | Вызначае свае эмацыянальныя адносіны да зносін П. М. Машэрава з маці *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)* |

**Стратэгічная задача развіцця асобы вучня як патрыёта і грамадзяніна прадвызначае мэтазгоднасць тэрытарыяльна-культурнай і нацыянальна-грамадзянскай ідэнтыфікацыі малодшага школьніка пры пазнанні ім культурна-гістарычнага асяроддзя Беларусі і азнаямленні з каштоўнаснымі арыенцірамі сучаснай беларускай нацыі.**

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Герой Беларусі спартсменка Дар'я Домрачава | | Падрыхтоўка інфармацыі аб ураджэнцах Беларусі — чэмпіёнах Алімпійскіх гульняў | Вызначае патрыятычную пазіцыю Дар'і Домрачавай *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урок 31. Сучасная Беларусь** | | | |
| Утварэнне Рэспублікі Беларусь | Складанне стужкі часу.<br>Удзел у экскурсіях у мясцовыя музеі, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Вызначае паслядоўнасць гістарычных падзей (першае згадванне пра Полацк, утварэнне БССР, утварэнне Рэспублікі Беларусь) праз абазначэнне іх дат на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрмінаў (Канстытуцыя, Прэзідэнт) з апорай на ўласныя веды і з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| Усебеларускі народны сход як вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя ў Рэспубліцы Беларусь | | Тлумачэнне раней засвоенага тэрміна «веча» | Вызначае ролю Усебеларускага народнага сходу Рэспублікі Беларусь, які выконвае функцыю веча — народнага сходу, што існаваў у часы Полацкага княства — першай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| Беларусь — адна з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі | Складанне стужкі часу | | Вызначае паслядоўнасць гістарычных падзей (удзел Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў заснаванні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, утварэнне Рэспублікі Беларусь, падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы паміж Беларуссю і Расіяй) праз абазначэнне іх дат на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)*<br>Тлумачыць прычыну ўдзелу БССР у заснаванні ААН *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка, 2 красавіка, 3 ліпеня) | Складанне плана святкавання (сцэнарыя свята) | Мадэліраванне дзеянняў (мерапрыемстваў) | Удзельнічае ў святкаванні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Першы Герой Беларусі лётчык Уладзімір Карват. Героі Беларусі лётчыкі Андрэй Нічыпарчык і Мікіта Куканенка | Удзел у сустрэчах са знакамітымі землякамі з падрыхтоўкай пытанняў | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Складае кароткае апісанне пра помнік лётчыкам Андрэю Нічыпарчыку і Мікіце Куканенку ў Баранавічах *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)*.<br>Вызначае свае эмацыянальныя адносіны да подзвігу лётчыкаў *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, чытацкая адукаванасць)* |
| **Урок 32. Сцяг беларускай дзяржавы** | | | |
| Сімволіка колераў Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Адлюстраванне ў арнаменце старажытных традыцый і працавітасці беларускага народа | Удзел у экскурсіях у мясцовыя музеі, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Тлумачыць элементы сімволікі Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)*.<br>Складае кароткае апісанне пра плошчу Дзяржаўнага сцяга і яго знаходжанне на касмічнай арбітальнай станцыі |
| Чырвоны сцяг — сімвал мужнасці нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны | Удзел у экскурсіі ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | | Вызначае свае эмацыянальныя адносіны да чырвонага сцяга як сімвала мужнасці нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, подзвігу лётчыкаў *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 33. Дзяржаўныя герб і гімн** | | | |
| Герб як сімвал дзяржавы. Адлюстраванне ў Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь яе тэрыторыі, традыцый нашых продкаў, гатоўнасці жыхароў да абароны сваёй Радзімы | Удзел у экскурсіях у мясцовыя музеі, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Тлумачыць элементы сімволікі Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з тэкставай у наглядна-вобразную | Тлумачыць словы Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь «Мы, беларусы — мірныя людзі» *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)*.<br>Спявае Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь з выкананнем адпаведнай працэдуры *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |
| Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь | Складанне плана святкавання (сцэнарыя свята) | | Удзельнічае ў святкаванні Дня Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |

***Заканчэнне***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Касманаўты — ураджэнцы Беларусі. Беларускі касманаўт Герой Беларусі Марына Васілеўская | Вызначэнне рэчы, якую прапануецца даставіць у якасці сімвала беларускасці на касмічную станцыю | Падрыхтоўка інфармацыі пра ўдзел ураджэнцаў Беларусі ў асваенні космасу | Вызначае прыналежнасць касманаўтаў — ураджэнцаў Беларусі — да розных дзяржаў *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |

Такім чынам, фарміраванне функцыянальнай адукаванасці малодшых школьнікаў грунтуецца на тэарэтычнай распрацоўцы і навукова-метадычным практыка-арыентаваным забеспячэнні рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу праз вызначэнне сутнасці ўніверсальных кампетэнцый і іх напаўненне прадметным зместам. Аперацыяналізацыя зместу абноўленай вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» прадугледжвае складанне і выкарыстанне тэхналагічнай матрыцы, якая змяшчае комплекс вучэбных дзеянняў, што забяспечваюць выпрацоўку ўмення асобы вучыцца і жыць у сучасным беларускім грамадстве.

Стратэгічная задача развіцця асобы вучня як патрыёта і грамадзяніна прадвызначае мэтазгоднасць тэрытарыяльна-культурнай і нацыянальна-грамадзянскай ідэнтыфікацыі малодшага школьніка пры пазнанні ім культурна-гістарычнага асяроддзя Беларусі і азнаямленні з каштоўнаснымі арыенцірамі сучаснай беларускай нацыі. Значную ролю набывае апора на краязнаўчы (радзімазнаўчы) матэрыял і гісторыю ўласнай сям'і з выкарыстаннем артэфактаў (прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры). Устойлівае асобаснае развіццё вучняў прадугледжвае мадэліраванне сваіх сацыяльных паводзін на прыкладзе канкрэтнай гістарычнай сітуацыі з улікам каштоўнасцей сям'і і сяброўства; набыццё вопыту эмацыянальна-каштоўнасных адносін да зместу вучэбнага матэрыялу з улікам ролі чалавека ў гісторыі з арыентацыяй на суперажыванне ўчынкам і пачуццям гістарычных персон. Вядучым сродкам навучання пры асваенні вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» выступае візуалізацыя зместу вучэбнага матэрыялу праз фарміраванне ў вучняў збіральных вобразаў культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі.

**Літаратура**


1. Концепция формирования универсальных компетенций детей и учащейся молодёжи (проект). — URL: https://adu.by/images/2023/05/kontseptsiya-proekt.pdf (дата обращения: 22.04.2024).
2. *Васюковіч, Л. С.* Праблема фарміравання функцыянальнай пісьменнасці ў айчыннай педагогіцы / Л. С. Васюковіч // Веснік адукацыі. — 2024. — № 1. — С. 10—20.
3. Формирование функциональной грамотности у учащихся начальной школы в процессе воспитательной работы // Веснік адукацыі. — 2023. — № 9. — С. 41—47.
4. *Русецкий, В. Ф.* Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В. Ф. Русецкий, О. В. Зеленко // Веснік адукацыі. — № 9. — 2020. — С. 15—22.
5. *Гершунский, Б. С.* Философия образования : учеб. пособие для студентов высш. и сред. педагог. учеб. заведений / Б. С. Гершунский. — М. : Московский психолого-социальный институт, 1998. — 432 с.

6. Рэкамендацыі па выніках вывучэння чытання і разумення тэксту (чытацкай адукаванасці) на беларускай мове вучняў IV класаў // Веснік адукацыі. — 2024. — № 4. — С. 15—31.
7. Как проектировать универсальные учебные действия в начальной школе: от действия к мысли : пособие для учителя / А. Г. Асмолов [и др.] ; под ред. А. Г. Асмолова. — М. : Просвещение, 2008. — 151 с.


*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 02.08.2024.*

FORMATION OF FUNCTIONAL LITERACY OF STUDENTS IN THE PROCESS OF MASTERING THE CONTENT OF THE CURRICULUM «MAN AND THE WORLD. MY HOMELAND IS BELARUS»
(Ending. Beginning at No. 10/2024)

Sergey V. Panov,
Leading Researcher at the Laboratory of Primary Education
Academy of Education, Ph.D. in Pedagogy, Associate Professor;
*swpanow@gmail.com*

The article highlights the theoretical aspects of functional literacy of primary school students, developed in accordance with the draft Concept of the formation of universal competencies of children and students. A technological matrix for the formation of universal competencies and functional literacy of students is proposed in accordance with changes in the structure and content of the curriculum for the academic subject «Man and the World. My Homeland is Belarus» by the 2024/2025 academic year.

Keywords: universal competencies; functional literacy; primary education; curriculum «Man and the World. My Homeland Is Belarus».

*Submitted 02.08.2024.*

К СВЕДЕНИЮ

**УВАЖАЕМЫЕ ЧИТАТЕЛИ!**

Журнал **«Веснік адукацыі»** («Вестник образования») включён в каталог РУП «Белпочта», в каталоги «Прессинформ», «Криэйтив Сервис Бэнд», «Екатеринбург-ОПТ», «Глобалпресс» (РФ) на I полугодие 2025 года.

Подписные индексы: **00725** — индивидуальная,
**007252** — ведомственная.